ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
1
ВЕРАСНЯ
СУБОТА
№ 23 (1436)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

ВІНШУЕМ ЛАЎРЭАТАЎ

рэспубліканскага тура VIII Усесаюзнага конкурсу работ маладых вучоных і спецыялістаў па грамадскіх навуках, прысвечанага 60-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна. У конкурсе прымалі ўдзел 160 маладых вучоных, выкладчыкаў і аспірантаў з 45 навуковых устаноў і ВНУ рэспублікі. Ганаровага звання лаўрэата рэспубліканскага тура конкурсу ўдастоены 15 маладых даследчыкаў-грамадазнаўцаў.

Сярод іх дыпломамі першай ступені адзначаны работы Г. М. Ільяшук — выкладчыцы кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў; А. М. Мажэйка — выкладчыцы кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў.

Дыпломамі другой ступені адзначаны работы Я. А. Броўкіна — аспіранта кафедры новай і навейшай гісторыі; А. П. Вардамацкага — аспіранта кафедры марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага камунізму БДУ імя У. І. Леніна.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

ДА ДНЯ ВЕДАЎ

паспяхова падрыхтаваліся калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта. Сёння ў святочным канцэрце прыме ўдзел народная агітбрыгада універсітэта, якой кіруе лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Л. І. Ярмак. На суд гледачоў калектыў вынесе праграму «Патрэбна нам песня...», прысвечаную 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, з якой ён выязджаў у час летніх канікулаў у гастрольную паездку па Комі АССР. У Дзень ведаў выступілі таксама народны ансамбль танца «Крыжачок», фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш» і іншыя калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта.

У. МАКАРЭВІЧ,
дырэктар студэнцкага клуба.

СВЯТА ПЕСНІ І ТАНЦА

студэнтаў прыбалтыйскіх рэспублік «Гаўдэамус-IX», прысвечанае 60-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна, прайшло нядаўна ў Таліне. Пастаянны госць гэтых свят (пачынаючы з трэцяга) — народны ансамбль танца «Крыжачок». Універсітэцкія артысты выступілі перад дэлегацыяй Фінляндыі, прынялі ўдзел у заключным канцэрце.

Н. ЯНУШКЕВІЧ,
член праўлення студэнцкага клуба.

СА СВЯТАМ ВЕДАЎ!

УКАЗАМ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР ДЗЕНЬ 1 ВЕРАСНЯ АБ'ЯЎЛЕНЫ ЎСЕНАРОДНЫМ СВЯТАМ — ДНЁМ ВЕДАЎ

ТРАДЫЦЫЙНЫ дзень пачатку навучальнага года — 1 верасня — у СССР будзе цяпер штогод адзначацца як Дзень ведаў. Увядзенне гэтага новага каляндарнага свята поўнасцю заканамернае. Савецкая дзяржава з самага пачатку свайго існавання лічыць развіццё народнай адукацыі і ўдасканальванне падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў сваёй важнейшай задачай. Увядзенне Дня ведаў заклікана яшчэ больш павысіць увагу ўсяго нашага народа да гэтай сферы жыцця Краіны Саветаў.

Поспехі СССР у галіне народнай адукацыі цяжка пераацаніць. Ад масавай непісьменнасці да ўсеагульнай абавязковай сярэдняй адукацыі — такі шлях пройдзены ў нашай краіне за параўнальна кароткі гістарычны перыяд. Любая адукацыя, аж да вышэйшай, даступна (бясплатная) для ўсіх, незалежна ад сацыяльнага і маёмаснага становішча, нацыянальнасці, партыйнасці, веравызнання, месца жыхарства. Роўнасць магчымасцей, у прыватнасці, забяспечваецца праз сетку вячэрніх і завочных навучальных устаноў, у якіх навучэнцам дзяржава гарантуе значныя льготы. Такі шлях паспяхова праходзяць мільёны і становяцца спецыялістамі вышэйшай кваліфікацыі.

У нашым універсітэце вучыцца каля 17 тысяч студэнтаў. Штогод на змену больш як 3 тысячам выпускнікоў зноў прыходзяць юнакі і дзяўчаты. Вось і сёлета мы прынялі папаўненне. Першае ўражанне: добрае папаўненне. Да нас прыйшлі вучыцца лепшыя з лепшых выпускнікоў школ, шмат юнакоў і дзяўчат, якія маюць ужо вопыт практычнай работы. Думаецца, нашы першакурснікі з першага дня знаходжання ва універсітэце дакажуць сваёй выдатнай вучобай і грамадскай актыўнасцю, што яны дастойны працягваць і памнажаць традыцыі універсітэта. А іх студэнцкае жыццё пачынаецца ў знамянальны дзень — упершыню ўся краіна святкуе Дзень ведаў.

Свята ведаў — свята ўсіх нашых выкладчыкаў, вучоных. А ў нас працуе 145 дактароў навук, прафесараў, больш як 800 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

Са святам, вас, паважаныя нашы педагогі, вучоныя, студэнты! Са святам усіх, хто распаўсюджвае веды і далучаецца да іх! Са святам, якое натхняе на плённую працу на карысць Радзіме!

Л. КІСЯЛЕЎСКІ,
рэктар Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, акадэмік АН БССР.

● ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР ●

У ДОБРЫ ШЛЯХ, ПЕРШАКУРСНІК!

Прыціхлі на нейкі час універсітэцкія калідоры, не дзяжураць ля ўваходу ў карпусы ўсхваляваныя бацькі, не мітусяцца нясмелыя абітурыенты... Гэта значыць ва універсітэце закончыліся ўступныя экзамены. Тыя юнакі і дзяўчаты, што паспяхова вытрымалі іх, заслужылі права называцца студэнтамі флагмана вышэйшай школы рэспублікі. Напярэдадні новага навучальнага года наш карэспандэнт сустрэўся з адказным сакратаром прыёмнай камісіі прафесарам У. П. Гольцавым.

— Усевалад Паўлінавіч, закончыліся ўступныя экзамены. Ці значыць гэта, што работа прыёмнай камісіі таксама закончана?

— Зразумела, не. У пачатку верасня мы будзем трымаць справаздачу аб рабоце прыёмнай камісіі-84, і будзе зацверджаны састаў новай, якая адразу ж пачне працаваць. Што датычыць прыёмнай камісіі-84, то яна пачала сваю работу ў верасні мінулага года. Быў зацверджаны састаў камісіі, у якую ўвайшлі прарэктары універсітэта, дэканы факультэтаў, прадстаўнікі партыйных і грамадскіх арганізацый, сфарміраваны тэхнічны сакратарыят, складзены каляндарны план работы.

У гэтым годзе загадам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР з мэтай далейшага ўдасканалення работы ВНУ па фарміраванню кантынгента студэнтаў зацверджана Палажэнне аб прыёмнай камісіі вышэйшай навучальнай установы. У ім вызначаны асноўныя функцыі прыёмнай камісіі, правы і абавязкі яе членаў і г. д. У строгай адпаведнасці з гэтым Палажэннем і вёўся прыём дакументаў і ўступных экзаменаў.

— Якасны паказчык набору першакурснікаў залежыць ад таго, як папрацавалі члены прыёмнай камісіі на працягу навучальнага года...

— Так. На працягу навучальнага года прыёмная камісія вяла прафарыентацыйную работу, мэта якой — вызначыць здольнасці юнакоў і дзяўчат, іх схільнасці да той ці іншай прафесіі, дапамагчы ў выбары спецыяльнасці. Для гэтага члены камісіі выязджалі ў гарады і вёскі, ва ўстановы і воінскія падраздзяленні, сустракаліся з маладымі калгаснікамі, рабочымі, воінамі Савецкай Арміі, са школьнікамі, праводзілі гутаркі, чыталі лекцыі. Нельга пераацаніць у прафарыентацыйнай рабоце і

(Заканчэнне на 2-й стар.).

Пяць гадоў пазнання

ДАРАГІЯ сябры! У вашым жыцці пачалася эпоха студэнцтва — пяць цудоўных гадоў пазнання, працы, даследавання.

І, зразумела, студэнцтва — гэта яшчэ і актыўная грамадская дзейнасць, і работа ў будатрадзе, і ўдзел у мастацкай самадзейнасці, і многае іншае.

На працягу ўсіх пяці студэнцкіх гадоў вы не павінны забываць пра асноўную сваю задачу, павінны памятаць ленінскія словы «вучыцца, вучыцца і вучыцца». Аднак ні ў якім разе вы не павінны думаць, быццам працэс вучобы звядзіцца да пасіўнага атрымання інфармацыі ад выкладчыкаў. Адным з важнейшых момантаў вышэйшай адукацыі з'яўляецца студэнцкая навуковая работа.

На кафедрах БДУ вам дапамогуць у выбары тэматыкі навуковага даследавання, да вашых паслуг абсталяваныя па апошняму слову тэхнікі лабараторыі і багатыя фонды бібліятэк. Ва універсітэце вы можаце атрымаць кансультацыі ў вядомых вучоных па розных галінах навукі. У БДУ працуе студэнцкае навуковае таварыства, якое штогод праводзіць традыцыйную красавіцкую студэнцкую навуковую канферэнцыю, прысвечаную дню нараджэння У. І. Леніна.

М. МАЖЭЙКА,
кандыдат філасофскіх навук.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР

АБ АБ'ЯЎЛЕННІ 1 ВЕРАСНЯ ЎСЕНАРОДНЫМ СВЯТАМ — ДНЁМ ВЕДАЎ

У адпаведнасці з пастановай Вярхоўнага Савета СССР ад 12 красавіка 1984 года «Аб Асноўных напрамках рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы» Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР **пастанаўляе:**

1. Аб'явіць 1 верасня ўсенародным святам — Днём ведаў.

2. Дапоўніць артыкул 1 Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 1 кастрычніка 1980 года «Аб святочных і памятных днях» (Ведомости Верховного Совета СССР, 1980 г., № 41, арт. 846) апошнім абзацам наступнага зместу:

«Дзень ведаў — 1 верасня».

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
К. ЧАРНЕНКА.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
Т. МЕНТЭШАШВІЛІ.

Масква, Крэмль, 15 чэрвеня 1984 г.

● ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР ●

У ДОБРЫ ШЛЯХ, ПЕРШАКУРСНІК!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

значэнне школ юнага матэматыка, біёлага, фізіка, хіміка, праграміста і г. д. Тут найбольш поўна выяўляюцца здольнасці школьнікаў, яны бліжэй знаёмяцца з будучай спецыяльнасцю. Вялікая роля належыць і падрыхтоўчым курсам. Веды, набытыя тут, аказваюць вялікую дапамогу абітурыентам у час здачы ўступных экзаменаў.

— Усевалад Паўлінавіч, на якім факультэце работа прыёмнай камісіі была больш эфектыўнай?

— Аб гэтым у нейкай ступені сведчыць колькасць пададзеных заяў. На юрыдычным факультэце на 175 месц прэтэндавалі больш як 600 чалавек. Тут камісіі па прыёму дакументаў давялося добра папрацаваць. Вялікі конкурс быў і на спецыяльнасць гісторыя — каля 400 заяў (пяць чалавек на месца). Патрэбна сказаць, што ўсяго на дзённую форму навучання было пададзена 3700 заяў (план прыёму складаў 1800 чалавек). Гэта яшчэ раз гаворыць аб тым, што наш універсітэт, як і раней, застаецца ў ліку самых папулярных устаноў рэспублікі.

— Як Вы ацэньваеце агульны ўзровень ведаў абітурыента-84?

— Узровень падрыхтоўкі абітурыентаў даволі высокі. Сведчанне таму — высокі прахадны бал на большасці факультэтаў: гістарычны — 20, юрыдычны — 19, журналістыкі, біялагічны, фізічны, філалагічны факультэты, ФПМ — 18... У гэтым годзе да нас прыйшло больш як 800 абітурыентаў пасля выдатнага заканчэння школы, ГПТВ ці тэхнікума. Каля 80 працэнтаў медалістаў пацвердзілі свае трывалыя веды: здалі прафіліруючы прадмет на выдатна і сталі студэнтамі БДУ. Трывожыць тое, што з тых, хто прыйшоў да нас з выдатнымі дыпломамі пасля заканчэння тэхнікума ці ГПТВ, толькі 20—30 працэнтаў вытрымалі экзамены. Чым гэта тлумачыцца, сказаць цяжка.

— А які з экзаменаў выклікаў найбольшыя цяжкасці?

— Як заўсёды, для абітурыентаў найбольш цяжкім экзаменам была пісьмовая работа. Справа, напэўна, у тым, што некаторыя проста не змаглі правільна размеркаваць адведзены час, сабрацца. Гэта ў асноўным ад хвалявання. Шмат нездавальняючых адзнак атрымалі абітурыенты па гісторыі і замежнай мове. Гэта гаворыць аб тым, што падрыхтоўка ў школах (асабліва сельскіх) па такіх прадметах вядзецца не на належным узроўні.

— Усевалад Паўлінавіч, напэўна можна акрэсліць нейкія характэрныя асаблівасці прыёму гэтага года?

— Вы ведаеце, што зараз вялікая ўвага ўдзяляецца пытанню больш шырокай падрыхтоўкі настаўнікаў з універсітэцкай адукацыяй. Каб арганізаваць планавую падрыхтоўку настаўнікаў для сельскіх школ, МінВНУ БССР і Міністэрства асветы БССР распрацавалі план унутрырэспубліканскага пазаконкурснага прыёму сельскай моладзі ва універсітэты Беларусі на 1984 год. У адпаведнасці з гэтым планам нам патрэбна было залічыць на розныя спецыяльнасці 155 чалавек. На жаль, не ўсе рэкамендаваныя паспяхова вытрымалі ўступныя экзамены. Гэта вынік таго, што кіраўніцтва некаторых сельскіх школ не з належнай адказнасцю аднеслася да рашэння МінВНУ БССР і Міністэрства асветы рэспублікі і накіравала ва універсітэт абітурыентаў з нізкімі ведамі. Гэта па-першае.

Па-другое, у бягучым годзе на механіка-матэматычным, фізічным (у мінулым толькі на фізічным), філалагічным факультэтах, ФПМ быў адкрыты прыём па эксперыменту, гэта значыць са здачай двух экзаменаў на добра і выдатна (пры наяўнасці добрых і выдатных адзнак у атэстаце.) Эксперымент аказаў пэўны ўплыў на ўзрастанне конкурсу і павелічэнне прахаднога бала.

І нарэшце апошняе. У гэтым годзе ўпершыню ва універсітэце па спецыяльнасці геаграфія вёўся прыём экзаменаў з выкарыстаннем ЭВМ. Гэта патрабавала ад прыёмнай і экзаменацыйнай камісій дадатковых намаганняў і стварыла пэўныя цяжкасці ў рабоце. Але радасна адзначыць, што эксперымент прайшоў паспяхова.

— У гэтым годзе ўпершыню пры паступленні ў ВНУ сярэдні бал атэстата не ўлічваецца і адпаведна не адыгрывае ніякай ролі. Як Вы адносіцеся да гэтага новаўвядзення?

— Тут катэгарычна заяўляць нельга. Шмат меркаванняў гавораць і за і супраць сярэдняга бала. Мой пункт гледжання? Я лічу, што ўлічваць сярэдні бал атэстата неабходна. У народзе кажуць, што экзамен — гэта латарэя. І ў нейкай ступені маюць рацыю. Ці мала што можа здарыцца на экзамене: абітурыент разгубіўся, яму папаўся, як кажуць, цяжкі білет (кожнаму зразумела, што ў школьнай праграме ёсць тэмы больш складаныя, ёсць лягчэйшыя). Такім чынам, абітурыент, сярэдні бал атэстата ў якога, напрыклад, 4,5, атрымаўшы адзнаку ніжэй, чым ён патэнцыяльна мог, канкурыруе з тым, у каго атэстат здавальняючы і каму проста пашанцавала. І ўрэшце паступае той, у каго сярэдні бал ніжэйшы.

Сярэдні бал атэстата — велічыня, якая паказвае, як чалавек вучыўся ў школе, велічыня, якая характарызуе агульны ўзровень падрыхтоўкі школьніка. А ад гэтага залежыць у будучым паспяховасць студэнта. І яшчэ. Што ж будзе для школьніка стымулам у вучобе, калі яго атэстат нікому не патрэбны? Ён акрэсліць сабе кола прадметаў, якія некалі «спатрэбяцца», а астатнія... Навошта дарэмна сілы траціць?

— І апошняе, традыцыйнае пытанне. Вашы пажаданні новаму папаўненню?

— У першую чаргу кожнаму першакурсніку жадаю ўпэўніцца, што ён зрабіў правільны выбар, бо самае горшае — расчаравацца ў будучай прафесіі. Жадаю поспехаў у вучобе, плёну ў навуковым пошуку, высокіх дасягненняў у спорце, мастацкай самадзейнасці... Карацей, жадаю дасягнуць усяго, чаго хацелі. Каб студэнцкія гады засталіся самым цудоўным успамінам на ўсё жыццё.

Запісала З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

● ФОТАРЭПАРТАЖ ●

Быў першы дзень экзаменаў...
Мінуў роўна месяц, як наш фотакарэспандэнт Мікалай ДУБОВІК зрабіў гэтыя здымкі на розных паверхах і ў аўдыторыях фізічнага корпуса, дзе ў тыя дні цяпер ужо былыя абітурыенты-84 аспрэчвалі сваё права быць залічанымі на абраны факультэт.

«БУДЗЬЦЕ ЗАЎСЁДЫ МАЛАДЫМІ»

ДАРАГІЯ ПЕРШАКУРСНІКІ! Сёння ў вашым лёсе наступае адказны момант: вы пачынаеце вучобу ва універсітэце. Першы курс — час цяжкі і радасны. Ён поўны хвалявання, надзей, адкрыццяў. Тут пачынаецца спецыяліст, тут закладваецца фундамент, у якім не павінна быць зафарбаваных, залатаных месц. Бясспрэчна, асноўная задача студэнта — паспяхова вучыцца, у поўным аб'ёме авалодаць праграмным матэрыялам, выпрацаваць прафесійныя навыкі, расшырыць ідэйна-тэарэтычны кругагляд, сфарміраваць марксісцка-ленінскі светапогляд, камуністычную мараль. Але жыццё тады праходзіць цікава, калі яно запоўнена добрымі справамі. У вас адкрываюцца шырокія магчымасці для ўдзелу ў рабоце навукова-даследчых гурткоў, семінараў, дзе пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў вы далучыцеся да творчага пошуку. Патрэбна толькі выбраць занятак па душы.

Больш актыўна ўдзельнічайце ў рабоце камсамольскіх, прафсаюзных арганізацый, у лекцыйнай прапагандзе, шэфскай рабоце. Шмат карыснага і неабходнага дасць вам удзел у органах студэнцкага самакіравання, рабоце народных дружын па ахове і падтрыманню грамадскага парадку і г. д. Прыжаданні можна атрымаць дадатковую прафесію, займаючыся ва універсітэцкіх гуртках, на аддзяленнях факультэта грамадскіх прафесій.

У адрозненне ад сярэдняй школы вучоба ва універсітэце патрабуе ад вас значна большай актыўнасці, ініцыятывы, самастойнасці. Вы самі становіцеся «кантралёрамі» сваёй дзейнасці. А гэта не проста. Вам патрэбна будзе навучыцца не толькі працаваць, але і жыць у складаным калектыве ВНУ, жыць самастойна. Паступленне ва універсітэт нібы перагортвае старонку ў вашым жыцці. А гэта важны і самастойны крок у фарміраванні самой асобы. Ацаніць свае здольнасці, знайсці тое месца ў жыцці, якое прынясе вам самае цудоўнае пачуццё — пачуццё апраўданасці свайго выбару... Вось да чаго вы павінны імкнуцца.

Універсітэт з гэтага часу тое месца, дзе будзе фарміравацца ваша асоба. Умовы студэнцкага жыцця садзейнічаюць гэтаму. Памятайце, што вам патрэбна навучыцца вучыцца. Вы, напэўна, ведаеце, што дзеяслоў «вучыцца» азначае «вучыць сябе». Адукацыя тым больш эфектыўная, чым больш вы здолееце навучыць сябе. Гэта патрабуе выхавання пэўнай дысцыпліны вучобы як дысцыпліны працы.

Спецыяліст нашай эпохі — гэта перш за ўсё актыўная асоба, узброеная прафесійнымі ведамі, камуністычным светапоглядам. Гэта асоба, якую павінна сфарміраваць ВНУ. Вышэйшая адукацыя — самы прамы шлях папаўнення інтэлектуальнага патэнцыялу краіны. Вось чаму фарміраванне асобы, яе адукацыя і выхаванне становяцца сёння важнейшай праблемай краіны.

Дарагія сябры! У свой час вы станеце важным звяном у сістэме народнай гаспадаркі канца XX—пачатку XXI стагоддзя. Гэта накладвае на вас вялікую адказнасць. Час вашай вучобы павінен стаць не толькі гадамі падрыхтоўкі да жыцця, але ўжо і самім жыццём. Выхоўвайце ў сабе пачуццё адказнасці і незаспакоенасці за агульную справу. Імкніцеся быць саўдзельнікамі ўсіх падзей, якія адбываюцца ў свеце. Вызначайце сваё месца ў ім. Тут многае залежыць ад вашай волі і настойлівасці. Не бойцеся задаваць пытанні — лектар зацікаўлены ў іх, не саромейцеся таварыша — ён заўсёды дапаможа.

А ў канцы мне вельмі хочацца прывесці словы акадэміка К. І. Скрабіна, якія ён сказаў пры выступленні перад студэнтамі: «Калі вы здолееце на працягу ўсяго жыцця захаваць яркую свежасць думкі, кіпучую энергію, мужнасць, аптымізм, сціпласць, нястомную прагу ведаў, самаадданую любоў да сваёй працы, чалавецтва, да сваёй Радзімы; калі вы здолееце не толькі захаваць, але і абвастрыць прагу да ўсяго цудоўнага — ці то прыгажосць прыроды, каштоўнасці сусветнай культуры, ці то такія тварэнні чалавецтва, як навука, мастацтва, літаратура; калі вы, нарэшце, будзеце ўспрымаць, асіміляваць усё чыстае, светлае, высакароднае і прагрэсіўнае, то вы на ўсё жыццё захаваеце маладосць!

Будзьце заўсёды маладымі, бо маладосць ва ўсіх відах цудоўная!».

Р. ЖМОЙДЗЯК,
дэкан геаграфічнага факультэта.



КАМУ СПАДАРОЖНІЧАЕ ПОСПЕХ

— МАМ, ну чаго ты са мною паедзеш? Хіба ты можаш мне чым-небудзь дапамагчы? Толькі час дарэмна марнаваць будзеш.

— І не гавары. Дома я не ўседжу.

А зараз давайце пакінем удзельнікаў гэтай размовы пакуль што дома, а самі перанясёмся ў думках ва універсітэт.

Для універсітэта сем гадзін раніцы—час даволі ранні. Звычайна ажывае ён а дзевятай гадзіне. А вось у жніўні шумна, мнагалюдна тут значна раней. І, напэўна, калі б раптам здарылася такое, што хто-небудзь згубіў лік дзён і апынуўся на плошчы ля універсітэта, то адразу б зразумеў: сёння першае жніўня. У абітурыентаў пачаліся ўступныя экзамены.

А вось паявіліся і нашы знаёмыя Ірына і яе мама Зінаіда Васільеўна Максімавы. Даўняя мара Ірыны — стаць студэнткай хімічнага факультэта. Каб мара гэта збылася, дзяўчыне давялося прыкласці шмат намаганняў. На працягу дзесяці гадоў — выдатная вучоба ў школе, удзел у хімічных гуртках, выступленні на алімпіядах... І зараз недзе праз гадзіны дзве-тры стане вядома, наколькі эфектыўнай была гэта праца.

Ірына набліжаецца да дзвярэй. Па праўдзе кажучы, гэта зрабіць не вельмі проста. Мамы, таты, праводзячы сваіх Сярож, Тань, Свет, шчыльна абступілі іх з усіх бакоў. Да іх далучаецца і мама Ірыны.

Пакуль усе балельшчыкі стаяць даволі ціха. Толькі зрэдку перакінуцца словам таты, цяжка ўздыхнуць мамы. З цягам часу размовы набываюць больш ажыўлены характар.

— Вось у майго Віці... — дзеліцца сваімі думкамі тата.

— А мая Анжэлачка... — дадае мама.

Чым вышэй падымаецца жніўеньскае сонца, тым больш знаёмяцца бацькі. Недзе ў поўдзень яны ўжо збіраюцца асобнымі групкамі, як даўнія знаёмыя. Настолькі збліжае іх хваляванне:

— Далёка не кожнаму шанцуе з першага разу паступіць. Здараецца і такое, што пасля няўдачы, на наступны год абітурыенты паступаюць у любую іншую навучальную ўстанову. Тым пахвальней імкненне юнакоў і дзяўчат, негледзячы на вялікі конкурс, атрымаць спецыяльнасць, аб якой яны марылі з дзяцінства. Мне здаецца, што для такіх людзей, якія па-сапраўднаму любяць сваю прафесію, неабходна зрабіць некаторую палёгку пры паступленні. Напрыклад, знізіць прахадны бал. Дарэчы, гэтую думку выказваюць і многія выкладчыкі. Яны таксама зацікаўлены ў такіх студэнтах.

— А як вы адносіцеся да новага правіла прыему ў ВНУ (без уліку сярэдняга бала атэстата)?

— Я лічу, што сярэдні бал атэстата патрэбна захаваць. Нярэдка здаралася такое, што іменна паўбала атэстата было рашаючым пры залічэнні абітурыента ў ВНУ. Ды і нездарма ж атэстат называюць атэстатам сталасці. У ім усе веды на віду.

— А я не згодны з такім меркаваннем. Чаго грахі таіць, ёсць у нас і такія «міласэрныя» настаўнікі, якія рады старацца, каб для сваіх выпускнікоў зрабіць добры атэстат. А тут адзнакі ставяць зусім незнаёмыя людзі. Я наогул аддаю перавагу «аўтаматызаванаму» экзамену. Экзамену, які прымае ЭВМ. Такі метад ужываецца ўжо ў большасці інстытутаў і універсітэтаў краіны.

...А вось паяўляюцца і тыя, хто ўжо вытрымаў экзамен. Яшчэ здалёку па тварах, паходцы юнакоў і дзяўчат можна зразумець, наколькі паспяховым ён быў. Адразу ж настрой дзяцей перадаецца і бацькам. Нехта адыходзіць вясёлы, а нехта...

— Што здарылася, Алена? Чаму ты такая засмучаная?

Справа ў тым, што я добра ведаю гэтую дзяўчыну. Добра ведаю і яе жаданне вучыцца на журфаку. Яна пастаянна супрацоўнічае з рэдакцыямі газет. Ужо два разы паступала. Няўжо зноў асечка?

— У нашым жыцці бываюць такія выпадкі, якія могуць нечакана карэнным чынам змяніць ход падзей. Так і ў мяне. Варта было паштальёну памыліцца адрасам і не прынесці мне выклік на творчы конкурс, як я аўтаматычна засталася па-за мяжой абітурыентаў.

...Радасна выбягае Ірына: выдатна. Вось яно, абітурыенцкае шчасце.

Хвалююцца абітурыенты, хвалююцца бацькі...

А. МАТУСЕВІЧ,
наш кар.

РАСЧЫНЯЕ ДЗВЕРЫ АЛЬМА МАТЭР

ЯШЧЭ ЎЧОРА ты быў абітурыентам. Яшчэ ўчора для цябе ўсё было складана і невядома. Яшчэ ўчора ты так верыў у гэты шчаслівы білет. А сёння... Сёння збылася твая запаветная мара — ты стаў студэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Сёння ты адчуваеш сябе тут гаспадаром. Ты тут ужо свой чалавек: на цябе звяртаюць увагу старшакурснікі, табою цікавяцца выкладчыкі. Хто ты? Што можаш? Але згадзіся, табе яшчэ не вельмі проста разабрацца ў лабірынце універсітэцкіх калідораў і лесвіц, цябе цікавіць мноства незнаёмых слоў на дзвярах кабінетаў і аўдыторый. Таму ў мяне ёсць прапанова: давай адправімся ў падарожжа. У падарожжа па універсітэту. Не забудзься прыхапіць з сабою студэнцкі білет. Зараз гэта тваё галоўнае пасведчанне аб прыналежнасці да студэнцкай сям'і.

Куды мы заглянем спярша? Ты здагадаўся. Так, у рэктарат. Ты ўжо ведаеш, што ад сесіі да сесіі жывуць студэнты весела. Іменна адсюль, з рэктарата, сыходзяць загады. І гэты, аб пачатку сесіі і яе заканчэнні таксама. А зараз падымемся трошкі вышэй. З камітэтам камсамола ты, напэўна, ужо пазнаёміўся тады, калі станавіўся на камсамольскі ўлік. А вось у бібліятэцы яшчэ не быў. Паглядзі, якое тут мноства кніг. Ты зможаш знайсці тут усё, што цябе цікавіць. А добразычлівыя бібліятэкары — бачыш, як яны завіхаюцца зараз ля кніжных паліц, — дапамогуць табе ў выбары, дадуць карысную параду.

Помніцца, ты казаў, што любіш танцаваць. Знаёмся: танцавальны ансамбль «Крыжачок». Майстэрства гэтага калектыву шырока вядома за межамі рэспублікі. Займаюцца тут хлопцы і дзяўчаты з ахвотай і цікавасцю. А можа, у цябе ёсць акцёрскі талент? Тады, калі ласка, у народны тэатр універсітэта.

Мы зусім забыліся, што ты спартсмен. Які від спорту табе больш да спадобы: валейбол, баскетбол, барацьба, гімнастыка, лёгкая атлетыка? Любым з гэтых відаў ты зможаш займацца ва універсітэцкіх секцыях. А яшчэ стала традыцыяй праводзіць ва універсітэце кубак першых курсаў па кросу. Гэта будуць твае першыя спаборніцтвы, у якіх ты зможаш выступіць са сваімі новымі сябрамі, са сваёй групай, курсам.

А ты, дарэчы, студэнт якога факультэта? Выпадкова не ФГП? Ты здзіўлены? Так, у нас ва універсітэце называюць трынаццаты факультэт—факультэт грамадскіх прафесій. Тут працуюць розныя аддзяленні: школа маладога лектара, школа арганізатараў грамадска-палітычнай работы, бальных танцаў, стэнаграфіі...

Ну, калі ты не студэнт ФГП, то, відаць, біёлаг. Калі так, то, дарагі першакурснік, я табе шчыра зайздрошчу. Ваш біятэатр славіцца на ўвесь універсітэт. А калі ты філолаг, то гэта значыць, што ў цябе ёсць магчымасць стаць членам літаб'яднання «Узлёт».

На пятым паверсе галоўнага корпуса размешчаны музей гістарычнага факультэта. Значная колькасць калекцыі — з археалагічных раскопак, якія штогод праводзяць студэнты. Асаблівую цікавасць уяўляе нумізматычны аддзел. Сабраная калекцыя манет высока цэніцца не толькі ў рэспубліцы, але і ў краіне. Так што калі захапляе такая работа, не чакай, пакуль цябе паклічуць, а сам прапануй свае паслугі. Усе з радасцю прымуць тваю дапамогу.

Больш чым дзесяць гадоў на факультэце прыкладной матэматыкі існуе народная агітбрыгада. Званне «народная» яна атрымала за цікавыя спектаклі, якія расказваюць аб жыцці студэнтаў факультэта. Цябе, першакурснік, чакаюць і тут.

Як бачыш, справы хопіць кожнаму. Права выбару за табой. Усё залежыць ад таго, як ты зможаш размеркаваць свой час. Плануючы яго, усё ж не забывай, што галоўнае для цябе—гэта вучоба. Не прытрымлівайся думкі тых студэнтаў, якія перакананы, што вывучыць прадмет можна за адну ноч перад экзаменам. Не забывай пра народную мудрасць: тое, што хутка здабыў, хутка згубіш.

Ты робіш першыя крокі ў студэнцкае жыццё. Папутнага ветру табе, першакурснік!

А. АНАТОЛЬЕВА,
наш кар.

«Абітурыент - 84»

КОЖНЫ ГОД БДУ імя У. І. Леніна гасцінна расчыняе свае дзверы перад тысячамі абітурыентаў. Адны з іх марылі аб будучай прафесіі з дзяцінства, выбар другіх у многім вызначылі бацькі, трэціх захапілі цікавыя расказы сяброў, студэнтаў — байцоў будаўнічых атрадаў, удзельнікаў зорных паходаў — аб непаўторных гадах студэнцкага жыцця. Толькі сам студэнт найбольш поўна і цікава зможа расказаць аб сваёй вучобе, аб тым, чым захапляе выбраная спецыяльнасць. З гэтай мэтай арганізаваны штаб «Абітурыент-84», у састаў якога ўвайшлі 68 чалавек. Мы імкнуліся падабраць сабе студэнтаў, якія маглі б зацікаўлена і кваліфікавана растлумачыць будучым абітурыентам правілы прыёму ва універсітэт, азнаёміць з праграмай уступных экзаменаў, расказаць аб будучай прафесіі. Работа штаба была накіравана на актывізацыю прафарыентацыйнай работы ў школах, прафтэхвучылішчах, рабочых інтэрнатах, на аказанне метадычнай дапамогі паступаючым пры афармленні дакументаў і г. д.

Вялікая дапамога ў вядзенні прафарыентацыйнай работы нам была аказана з боку ідэалагічнага сектара камітэта камсамола універсітэта. У час зімовых канікулаў студэнтамі ўсіх факультэтаў і членамі штаба «Абітурыент» было прачытана 276 лекцый, зроблена 14 публікацый у друку. Удзельнікі зорных паходаў выступілі з тэматычнымі праграмамі агітбрыгад. Непасрэдны ўдзел прынялі члены штаба «Абітурыент» у правядзенні дзён факультэтаў і дзён адкрытых дзвярэй. У сваёй рабоце з іншагароднімі студэнтамі мы абапіраліся на шэфскія дагаворы, якія нядаўна заключылі камітэты камсамола факультэтаў з райкомамі камсамола. Сіламі штаба быў зроблены спецвыпуск газеты «Абітурыент-84» па кожнаму факультэту, падрыхтавана наглядная інфармацыя. Але самая гарачая пара ў штаба «Абітурыент-84» пачалася ў час прыёму дакументаў. Працавалі камісія па афармленню дакументаў, стол даведак, камісія па размеркаванню месц у інтэрнаце. Сярод тых абітурыентаў, якія дрэнна здавалі ўступныя экзамены, мы праводзілі прафарыентацыйную работу па накіраванню іх у прафтэхвучылішчы.

Работа штаба «Абітурыент-84» нашага універсітэта адобрана аддзелам студэнцкай моладзі ЦК ЛКСМБ. На базе штаба БДУ была праведзена нарада старшынь штабоў «Абітурыент» ВНУ горада Мінска.

І. КРАТОВІЧ,
старшыня штаба «Абітурыент-84».

Ветер века суров,
но его я, как нежность,
приемлю,
Не бывает чудес,
но сбывается
сказка в степи:
Прорастает поселок
из колышка,
вбитого в землю.
Ради будущей сказки
труднейшую прозу
стерпи.
Мы пришли в этот мир,
так неужто он лучше
не станет,
Хоть на чуточку лучше,
когда из него
мы уйдем?

РАЗАМ — ДРУЖНАЯ СЯМ'Я

Для нас, пераважнай большасці байцоў камуністычнага атрада імя М. Расковай механіка-матэматычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, гэта быў першы працоўны семестр, якога ўсе чакалі з радасцю і хваляваннем.

Чаму з хваляваннем? Ды таму, што атрад наш не зусім звычайны, калі ўжываць у адносінах да яго прыметнік «будаўнічы». Мы не будавалі жылыя дамы або фермы, не «змагаліся» з пустазеллем на неабсяжных палетках калгасаў і саўгасаў. Атрад працаваў у дзіцячых дашкольных установах горада Мінска.

СТВАРАЎСЯ ён на базе І курса педагагічнага патока механіка-матэматычнага факультэта. Ідэя стварыць такі атрад паявілася ў нас яшчэ мінулай восенню, тады, калі мы ўсе разам працавалі на сельгасработах. Жылі дружна, весела, працавалі ад душы. Карацей кажучы — склаўся калектыў. Тады хтосьці і прапанаваў: «А добра было б, каб летам мы не раз'ехаліся па розных будатрадах, а працавалі разам...» І, як кажуць, няма нічога немагчымага — вось ужо і закончыўся працоўны семестр. Наш, педатрадаўскі...

Неяк днямі мяне запыталі: каго з нашых байцоў можна было б вызначыць як лепшых педагогаў? Ведаеце, я нават разгубілася ад нечаканага пытання. У нас проста не было такога дзялення: лепшы — горшы. Мы ўсе рабілі агульную справу, дапамагалі адзін аднаму, часам спрачаліся. Але калі б мне давялося назваць лепшых байцоў, то я, не вагаючыся ні хвіліны, пералічыла б усіх разам з камандзірам Святланай Качурай і камісарам Святланай Досінай.

Мы цалкам аддавалі сябе рабоце. А калі часам на вочы трапляўся ліст календара, які няўмольна адмінусоўваў дзень за днём, то не верылася, што давядзецца развітацца з нашымі вясёлымі, неўтаймоўнымі «чамучкамі».

Але развітанне наша не будзе доўгім. Мы ўжо вырашылі: у будучым годзе зноў збяромся ў наш будатрад.

А. ПІЛЮЦІК,
баец атрада
імя М. Расковай.

ВІНШУЕМ

байцоў студэнцкага будаўнічага атрада імя Ліліі Карастаянавай з узнагароджаннем за працоўныя дасягненні і ўдзел у студэнцкім фестывалі грамадай Ямбальскага акругавага камітэта Дзімітраўскага камуністычнага саюза моладзі Балгарыі.

«ЯНЫ — ДОБРЫЯ»

Раніца ў гэтым маленькім двухпавярховым доміку пачынаецца не са званком будзільніка. Яшчэ да таго, як першы гарадскі аўтобус зашаргаціць па мокраму асфальту, у царстве арэляў-каруселяў загучыць вясёлае ку-ка-рэ-ку. Пецянпевень склікае сваіх маленькіх сяброў паглядзець, як нараджаецца новы дзень. І не зразумець яму, няўрымслівому гарлапану, што жыхары доміка ў гэты час яшчэ бачаць самыя цудоўныя, самыя казачныя сны.

СЁННЯШНІЯ дзеці не памятаюць, што год назад у іх доме Пеці зусім не было. Не ведаюць яны, што год назад дзяўчаты-студэнткі, прачынаючыся на золку, хвалявaліся, баяліся, тысячу разоў у думках уяўлялі, з чаго пачнуць. Ніколі з дзецьмі не працавалі, а тут адразу дзетдом...

Вакол мяне збіраецца са шчабятаннем чародка хлопчыкаў і дзяўчынак. Гэта тыя, хто памятае Наташу Прышывалка і Леакадзію Валодзька па мінуламу году.

Каця Асімчук: — Разам з цёцяй Наталляй мы загаралі і чыталі кніжкі.

Андрэй Чэчыр: — А мяне цёця Лёдзя вучыла пісаць вялікія літары і круглыя...

Толік Здобараў: — Разам мы гулялі, у «каравай», у «качак», у «слімака»...

Патрэбна сказаць, што сярод байцоў камуністычнага СБА «Маладосць-83» механіка-матэматычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна больш за ўсіх пашанцавала, напэўна, Наталлі і Лёдзі. Іх выхаванцы ў верасні гэтага года ўжо пайшлі ў школу, многае памяталі і з задавальненнем расказвалі. Хаця нарад ці пагадзіцца са мной Валя Марушка. Яе падапечным было па тры-чатыры гады, але і яны навыперадкі дзяліліся ўражаннямі аб сустрэчах з «сапраўдным» ваўком і «сапраўднай» лісой. Як я потым высветліла, байцы будатрада кожную нядзелю паказвалі ў дзіцячым доме лялечныя спектаклі, і дзеці запомнілі забаўных герояў з рускай казкі.

Сёлетні працоўны семестр быў трэцім у гісторыі існавання СБА бязвыплатнай працы «Маладосць». Закончылася сесія. І зноў дзяўчаты, перш чым пераступіць парог утульнага маленькага будынка, прачыталі: «Дашкольны дзіцячы дом № 2 г. Мінска». Але, зразумела, па ўсіх пытаннях пракансультаваліся ў Наташы Прышывалка, Светы Дзюба, Галі Краўчанка — «ветэранаў» «Маладосці», узнагароджаных значкамі ЦК ВЛКСМ.

— Якія ж яны, Наташа і Лёдзя? — пытаюся ў дзяцей на развітанне.

— Прыгожыя...

Сур'ёзны Толік Здобараў засяроджана моршчыць нос:

— Цёця Лёдзя добрая. Яна з намі гуляла...

Неўтаймоўная Анечка Чаркоўская гладзіць сваю кароткa пастрыжаную галоўку:

— Я хачу, каб і ў мяне былі такія валасы, як у цёці Наташы.

— Мама Наталля і зараз да нас прыходзіць, — дадае, падбегшы, Саша Гідон.

А. ГРЫШКЕВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

У дзень, калі вы чытаеце гэты нумар газеты, студэнцкі будаўнічы атрад «Мінск-84» вярнуўся ў сталіцу з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Цэлы месяц юнакі і дзяўчаты з розных факультэтаў універсітэта працавалі поплеч са сваімі нямецкімі сябрамі. А ўвечары збіраліся разам, і каля абавязковага ў такіх выпадках вогнішча гучалі песні. На рускай, беларускай і нямецкай мовах. Бо які ж будатрад без песні! Таму так старанна рыхтавалі ў СБА праграму выступлення агітбрыгады. Адзін з момантаў шматлікіх рэпетыцый вы і бачыце на гэтым здымку.

Фота А. Смольскага.

«НЫЦІКАЎ У НАС НЕ БЫЛО»

...І вечар той, наш першы канцэртны вечар на цэнтральнай сядзібе калгаса «Зорка», дзе мы працавалі гэтым летам, удаўся на славу. Доўга не адпускалі нас вяскоўцы са сцэны, раз-пораз выклікаючы на «біс». Пасля гэтага канцэрта механізатары, паляводы, з якімі мы штодня выходзілі раніцай на работу, сталі да нас больш уважлівымі, ветлівымі, «прызналі за сваіх».

Кажучы па шчырасці, калі прыехалі сюды, то спачатку не надта верылася, што няўтульную спартыўную залу ў школе з поспехам можна ператварыць у добрае жылое памяшканне для трыццаці чалавек, што можна неўзабаве авалодаць сакрэтам, як з небагатых кулінарных выраб аў хутка прыгатаваць апетытны абед. Ды і наогул тут мы навучыліся весці ўласную гаспадарку. Бо ў атрадзе — адны дзяўчаты.

Але калі ўжо гутарка зайшла пра гаспадарку, то, доўга не пералічваючы, зазначу, што ў нас было ўсё: ад праса да магнітафонных касет. Так што песімізм мы пакінулі тым, хто ў адказ на наша «паехалі ў жаночы будатрад!» скептычна ківаў галовамі ды адмахваўся, маўляў, хіба гэта будатрад.

Мы яшчэ раз пераканаліся: будзе ў будатрадзе жыццё цікавым ці не — залежыць ад нас саміх. Гэта ісціна. І няма чаго спасылацца на так званую спецыфіку: «у нас жа сельгасатрад...», «што тут зробіш у педатрадзе...», «якія там мерапрыемствы, калі байцы — правадніцы поезда дальняга прызначэння...».

Калі гаварыць пра работу, то і тут у нас справы ішлі нядрэнна, хаця работа для нас, у асноўным дзяўчат гарадскіх, не з лёгкіх. Нам даручылі праполку буракоў. Памятаю, як ужо праз тыдзень на ранішняй лінейцы камандзір атрада Алена Пекар падвяла першыя працоўныя вынікі: «4,25 га праполаты раней запланаванага тэрміну. Так трымаць!» Па агульных выніках сацыялістычнага спаборніцтва пераможцамі выйшлі С. Раманава, Н. Сёмкіна, Т. Грыдзюшка, В. Фядковіч. Няблага папрацавалі дзяўчаты і на нарыхтоўцы сена. А ў адзін са сваіх выхадных дзён байцы атрада выйшлі на калгасныя палеткі, каб потым зароблеяыя грошы пералічыць у фонд калгаса.

— **ДЗЯЎЧАТЫ, хутчэй, да пачатку застаецца менш за гадзіну, — раздаецца ўзрушаны голас камісара.**

— **А хто чытае лекцыю?.. Марына Загорская?.. А сцэнку-дыялог паспелі ўчора яшчэ раз прарэпеціраваць?..**

Так суботнім вечарам канчаюцца апошнія прыгатаванні нашага СБА «Рэпарцёр» факультэта журналістыкі да канцэрта ў мясцовым клубе вёскі Слабада, што на Уздзеншчыне.

— **Дзяўчаты, а можа паспрабуем заўтра праспяваць нашы прыпеўкі? — зноў пытаецца нехта з будатрадаўцаў, ужо выходзячы на ганак клуба.**

— **А што, слушная прапанова, толькі не забудзьце ўзяць з сабой нашы «фірменныя» хусцінкі...**

...Мінула працоўнае лета. Сёлета за плячыма байцоў «Рэпарцёра» нямала добрых і карысных спраў. Надоўга запомнілася ўсім свята адкрыцця лагера, удзел у традыцыйным Купаллі, сустрэча з ветэранам вайны В. Т. Трамбіцкім, валейбольныя турніры, дні імяніннікa...

Дзякуй за ўсё, працоўнае лета! Да новых сустрэч!

Э. ОЛІНА,
баец атрада «Рэпарцёр».

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

1 верасня 1984 г.

АТ 10370 Зак. 1389.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ